Хоцімская бібліятэчная сетка
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел маркетынгу




Хоцімск 2013

Хоцімская бібліятэчная сетка
Цэнтральная бібліятэка
Аддзел маркетынгу

# Пісьменнікі-землякі

**ДАВЕДНІК**

Хоцімск 2013

**Пісьменнікі-землякі : Даведнік [Тэкст] / Хоцімская бібліятэчная сетка, Цэнтральная раённая бібліятэка, Аддзел маркетынгу, [складальнік А.Ф.Лутчанкова ; адказны за выпуск Р.А. Касталонава] . — Хоцімск, 2013. — 17 с. іл.**

Даведнік змяшчае біябібліяграфічныя звесткі аб пісьменніках-ураджэнцах Хоцімскага раёна і тых, хто жыццёвым лёсам звязаны з Хоцімшчынай.

Выданне разлічана на шырокае кола чытачоў.

**Хоцімская раённая бібліятэчная сетка, 2013**

## АД СКЛАДАЛЬНІКА

Мэта гэтага біябібліяграфічнага Даведніка – коратка пазнаёміць з біяграфіямі пісьменнікаў-землякоў, іх творчасцю. У ходзе вялікай і крапатлівай даследчай работы ў даведніку былі сабраны ў адзіна матэрыялы з шматлікіх крыніц. Паведамляюцца асноўныя біяграфічныя факты: даты нараджэння пісьменнікаў, месца нараджэння, адукацыя, жыццёвы шлях, адзначаецца членства ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі. Называюцца творы пісьменнікаў-землякоў, у дужках пазначаецца год выпуску. Сабраныя звесткі, нажаль, не ва ўсім адрозніваюцца паўнатой: не давялося ў дэталях прасачыць жыццёвы шлях кожнага з іх, патрабуюць праверку некаторыя даты, магчыма, не поўны і сам спіс пісьменнікаў. Разам з тым мы спадзяёмся, што гэты матэрыял прадстаўляе пэўны інтарэс для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй хоцімшчыны, асабліва для настаўнікаў літаратуры, і ў любым выпадку можа стаць асновай для далейшай пошукавай работы. Біяграфіі размешчаны алфавітным парадку выдзеленых катэгорый: класікі, сучаснікі, маладыя аўтары.




## БРАЙЦАЎ Якуб Раманавіч



Беларускі празаік, драматург, паэт. Нарадзіўся 19 лютага 1861 года ў в. Забялышына. Скончыў Клімавіцкае павятовае вучылішча. З 2-й палавіны 1880-х гадоў у Маскве. З 1900 года на радзіме. У 1905 годзе за рэвалюцыйную дзейнасць быў пад наглядам паліцыі. З 1917 года сакратар Забялышынскага валаснога выканкама, потым павятовы пракурор Клімавіцкага павета. У 1925 годзе па стану здароўя пераехаў у в. Забялышына, дзе ў школе выкладаў курс земляробства. Член Усерасійскага саюза сялянскіх пісьменнікаў, супрацоўнік “Крестьянской газеты” (Масква).

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1880-я гады.

Аўтар аповясцяў “Няўдашачка Анюта” (1887), “Багацеі” (1889), “Гаспадар” (1929), апавяданняў “Старая вёска” (1899), “Юда” (1899), “Бяда цыгана”(1905), “Дудалёва лаза” (1884), апублікавана ў 1966), рамана «Сярод балот і лясоў» (1913-1916). У 2013 годзе ў выдавецтве «Регистр» выйшаў зборнік твораў Якуба Брайцава «Сярод балот і лясоў».

Рукапісы Я.Р.Брайцава захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Памёр 2 сакавіка 1931 года. Пахаваны ў в. Забялышына Хоцімскага раёна.

## ЗАРЫЦКІ Аляксей Аляксандравіч



Беларускі паэт. Нарадзіўся 22 сакавіка 1911 года ў г. п. Хоцімск Магілеўскай вобласці ў сям'і служачага.

У 1928 годзе скончыў сярэднюю школу ў Бабруйску, працаваў электраманцёрам на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце. У 1936 годзе скончыў Маскоўскі інстытут замежных моў. З 1938 па 1946 г. служыў у Савецкай Арміі. У 1941-1942 гг. удзельнічаў у

баях пад Арлом і Масквой, будучы памочнікам начальніка разведаддзела штаба аднаго з паветрана-дэсантных карпусоў. Затым у якасці інструктара армейскага палітаддзела прымаў удзел у баявых аперацыях на Волхаўскім і Ленінградскім франтах. Быў супрацоўнікам, пасля загадчыкам аддзела паэзіі часопіса «Полымя». Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1935 года.

Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Памёр 29 кастрычніка 1987 года.

Першы верш надрукаваў у 1927 годзе, а ў 1932 годзе выйшаў першы зборнік вершаў «Эпічныя фрагменты». У пасляваенны час выдаў кнігі паэзіі «Дняпроўскае рэха» (1946), «Арліная крыніца» (1947), «Наш сын» і «Світанскія сады» (1950), «Вершы і паэмы» (1952), «Залатое дно» (1955), «Праз бурныя парогі» (1957), «Пасылка ў рай» (1960), «Размова з сэрцам» (1961), «Вяртанне на зямлю» (1966), «Мая асяніна» і «У дарогу» (1973), «Талоны на бяссмерце» і «Пераклічка гадоў» (1974), «Каля вячэрняга кастра» (1979), «Трывожная госця» (1986). У 1965 годзе выдадзена кніга апавяданняў на рускай мове «Вересковый мед», у 1985 годзе - кніга ўспамінаў, крытычных артыкулаў, нарысаў «За словам-падарункам». У 1969 і ў 1981 гг. выйшлі Выбраныя творы ў 2-х тамах.

Перакладаў з расійскай, украінскай, нямецкай, польскай, лужыцка-сербскай моў. Асобнымі кнігамі выйшлі зборнік А.Туманяна «Казкі і легенды» (1958), паэма К.Данелайціса «Чатыры пары года» (1961), аповесць Г.Зегерс “Чалавек і яго імя”, Ю.Брэзана “Крыста” (1966), балада А.Міцкевіча «Свіцязанка» (1976) і кніга выбраных перакладаў «У свет па песні» (1978).

## КАРПЕНКА Міхаіл Фядотавіч



Беларускі паэт. Нарадзіўся 11 ліпеня 1930 года ў в. Максімаўка Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыў Гродзенскае культурна-асветнае вучылішча, працаваў дырэктарам Хоцімскага раённага Дома культуры. З 1951 года супрацоўнік абласной газеты “Магілёўская праўда”, потым карэспандэнт, літкансультант газеты “Піянер Беларусі” ў Мінску, адначасова вучыўся на вячэрнім аддзяленні Мінскага педінстытута. У 1954 годзе накіраваны на вучобу ў

Маскву ў Цэнтральную камсамольскую школу пры ЦК ВЛКСМ. З 1957 года ў г. Ашхабадзе, адказны сакратар газеты “Комсомолец Туркменистана”, намеснік рэдактара газеты “Чарджовская правда”. З 1959 года рэдактар газеты “Знамя труда” у г. Краснаводску, з 1971 года рэдактар абласной газеты “Ташаузская правда” ў г. Ташауз (Туркменістан). У 1965 годзе скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС у Маскве. У друку выступае з 1949 года.

Член Саюза пісьменнікаў СССР (1980), член Саюза журналістаў СССР.

За актыўны ўдзел у гаспадарчым і культурным будаўніцтве Міхась Фядотавіч Карпенка ўзнагароджаны двума Ганаровымі граматамі Прэзідыўма Вярхоўнай Рады Туркменскай ССР, двумя медалямі. Неаднаразова, на працягу трыццаці гадоў, збіраўся членам гарадскога і абласнога партыйных камітэтаў, з'яўляўся дэпутатам гарадскога і абласнога Савета.

За вялікія заслугі ў галіне культуры рэспублікі Указам Прэзідэнта Туркменскай ССР у лістападзе 1990 года М. Ф. Карпенка прысвоена ганаровае званне «Заслужаны працаўнік культуры Туркменскай ССР».

Памёр 15 красавіка 2006 года.

Аўтар зборнікаў вершаў: "Молодые крылья" (1959), "Степная криница" (1965), "Песня дутара" (1978), "Крылья дружбы" (1978), "Вишенка" (1980), "Походные костры" (1981), "Березовая ветка" (1983), «Красный колос» (1985), "Моя кочующая юрта" (1987), "Поющие пески" (1990), "Своею мерой" (1988), "Отцовское поле" (2001).

Займаўся Міхась Карпенка і мастацкім перакладам. На рускую мову ён перавёў шэраг вершаў туркменскіх, узбекскіх, каракалпацкіх, украінскіх і беларускіх паэтаў.

## ПРЫХОДЗЬКА Пятро (Пётр Фёдаравіч)



Беларускі паэт і перакладчык. Нарадзіўся 25 лютага 1920 года ў в. Альшоў Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям’і.

У 1936 г. працаваў кіраўніком спраў Хоцімскага райкама камсамола. Пасля заканчэння Магілёўскай газетнай партыйнай школы (1938) - адказны сакратар Хоцімскай раённай газеты “Калгасная звязда”. У 1939

годзе, пасля заканчэння Хоцімскай сярэдняй школы, паступіў у Камуністычны інстытут журналістыкі імя С.М.Кірава ў Мінску. У 1940 годзе прызваны ў Савецкую Армію. Удзельнічаў у баях на Бранскім фронце, на Курскай дузе, у вызваленні Беларусі, Польшчы, у баях за Берлін, за вызваленне Прагі. У пасляваенны час (з1947) працаваў у акруговай газеце "Во славу Родины" (Мінск), іншых ваенных газетах. У 1953 годзе дэмабілізаваны. У 1956 годзе скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Працаваў у часопісе "Беларусь" (1953-1954), газетах "Звязда" (1956-1957), "Літаратура і мастацтва" (1957-1961), на Мінскай студыі дакументальных фільмаў (1961-1966). У 1967-1971гг. - "Мастацкая літаратура". Член Саюза Пісьменнікаў з 1947 года. Памёр 30 лістапада 2006 года.

Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Аўтар зборнікаў вершаў і паэм: "Голас сэрца" (1947), "Салдаты міру" (1951), "Ранак над Эльбай" (1952), "Цёплы каравай" (1960), "Вішнёвы агонь" (1963), "Сонца раней узышло" (1967), "Калінавыя зоры" (1969), "Прызнанне" (1970), "Не здадзеныя вышыні" (1972), "На пераправе" (1974), "Плацдарм" (1978), "Лісты з паходаў" (1980), "Вячэрняя праверка" (1982), "Парог памяці" (1984, літаратурная прэмія імя А.Куляшова 1985), "Апаленыя вёрсты" (1986), "Водгулле грому" (1989), "Споведзь любові" (1990), "Па слядах маланкі" (1991).

Дзецям адрасаваны зборнікі вершаў: "Сустрэча з маленствам" (1967), "Каляка-маляка" (1981), "Сцяблінка" (1986), паэма "Сын камунара" (1973). Паводле народнага падання аб паходжанні назвы мястэчка Хоцімск стварыў паэму "Дар князёўны" (2001).

# Сучаснікі

## МІНКІН Алег Гаўрылавіч



Беларускі паэт і перакладчык. Нарадзіўся 31 сакавіка 1952 года ў в.Чарняўка Хоцімскага раёна. Вучыўся ў Хоцімскай васьмігадовай школе-інтэрнаце. Дзесяты клас скончыў у Бабруйскай школе-інтэрнаце №1. У 1969 годзе паступіў у Маскоўскі энергетычны інстытут. Пасля двух гадоў вучобы перавёўся на факультэт электрыфікацыі Маскоўскага інстытута інжынераў сельскагаспадарчай вытворчасці (1971-1975гг). Атрымаў спецыяльнасць інжынера-электрыка, накіраваны майстрам ва Улан-Удэ, у тэхкалону № 56. Працаваў электрамантажнікам, майстрам па будаўніцтве электрападстанцый. З Бураціі вярнуўся на Беларусь. З 1977 года працаваў інжынерам ў сістэме “Галоўтранснафта”, у тым ліку начальнікам брыгады на поўначы Цюменскай вобласці (г.Наябрск). З 1981 года інжынерам у Брэсце. З 1991 года жыве і працуе ў Вільнюсе. З 1998 года рэдактар газеты беларусаў Літвы “Рунь”. Друкуецца з 1980 года. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1988 года, Саюза пісьменнікаў Літвы з 1991 года.

Аўтар зборнікаў паэзіі: “Сурма” (1985), “Расколіна” (1991), “Пенаты” (1999), кніжкі для дзяцей “За месяцам месяц” (1994), кнігі прозы ў жанры фантастычнай антыўтопіі “Праўдзівая гісторыя Краіны Хлудаў” (1994).

Паводле беларускай народнай казкі напісаў п'есу “Як Лыска ваўком быў” (1985).

Пераклаў з польскай на беларускую мову кнігі паэзіі “Ідэі за мною” Ц.Норвіда (1993), “Пан Блішчынскі” Б.Лесьмяна, “Высокія травы” Л.Стафа (абедзьве 1994).

## РАМАНЕНКА Іван Кананавіч



Нарадзіўся ў 1932 годзе ў в. Елавец Хоцімскага раёна. Скончыў Ленінградскі горны інстытут. Працаваў на Урале. У 1962 годзе вярнуўся ў Беларусь, з таго часу жыве ў Салігорску, дзе ў аб'яднанні “Беларуськалій” працаваў да выхаду на пенсію на розных інжынерна-тэхнічных пасадах. А вольны час аддаваў паэзіі. Вершы Івана Раманенкі публікавалі ў часопісе "Савецкі шахцёр", у рэспубліканскіх газетах "Знамя юности", "Чырвоная змена", у мясцовых газетах "Шахцер", "Калійшчык Салігорска".

## САВУШЫНСКАЯ Надзея Феакцістаўна



Нарадзілася 12 верасня 1936 года ў вёсцы Бяседавічы Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці.

Пасля заканчэння Хоцімскай сярэдняй школы паступіла ў Мінскае вучылішча харчовай прамысловасці. Затым працавала лабарантам-тэхнолагам на хлебазаводах у Магілёўскай вобласці.

У 1959 годзе паступіла ў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію ў г.Горкі Магілёўскай вобласці.

Пасля заканчэння акадэміі працавала ў калгасе "За мір" Брэсцкага раёна, а затым - у МВА па птушкагадоўлі г. Мінска.

Пісаць вершы пачала з ранняга дзяцінства. Пачынала з прыпевак, песень. У студэнцкія гады друкавалася ў "Студэнцкай газеце". Друкуецца ў газетах "Наша жыццё" Мінскага раёна, "Беларуская ніва", "Мінская праўда".

У 2012 годзе Надзея Савушынская прынята ў Саюз пісьменнікаў Беларусі.

Аўтар зборніка вершаў "Палёт душы" (2011)

## ЦЕРАХАЎ Аляксандр Іванавіч



Празаік. Нарадзіўся 27 верасня 1951 года ў пасёлку Галубоўка Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыў Магілёўскае ГПТВ № 36 будаўнікоў і факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Будаваў горад Цеміртау ў Казахстане. Працаваў муляром, слесарам, трубаўкладнікам, шафёрам, мастаком-афарміцелем. З 1970-1972 гг. служыў у радах Савецкай Арміі. З 1981 года знаходзіўся на журналісцкай працы: быў карэспандэнтам магілёўскай раённай газеты, а з 1994 года – спецыяльны карэспандэнт абласной газеты "Магілёўскія ведамасці".

З апавяданнямі выступае ў перыядычным друку, публікуецца ў рэспубліканскім часопісе "Нёман", калектыўным зборніку літаратараў Магілёўшчыны "Дняпроўскія хвалі" (1993г), «Прыдняпроўе – маё натхненне» (2009г), "Прыдняпроўе" (2012г). З 2005 года Аляксандр Церахаў Член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

У 2007 годзе выдадзена кніга мастацкай прозы "Святая памяць", за якую ў 2008 годзе стаў лаурэатам літаратурнай прэміі Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі імя Івана Чыгрынава. Жыве ў Магілёве.

## ЮРКІН Іван Захаравіч



Генерал-маёр. Нарадзіўся 30 сакавіка 1949 года ў в. Малуноўка Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці.

Працоўную біяграфію пачынаў з выкладання фізікі і фізкультуры ў Язаўскай васьмігадовай школе Ершыцкага раёна Смаленскай вобласці (1966-67).

Пасля заканчэння БДУ (1972) служыў у Савецкай Арміі на афіцэрскіх пасадах (1972-74), потым на камсамольскай рабоце, 2-і сакратар Слаўгарадскага райкама ЛКСМБ Магілёўскай вобласці.

У органах дзяржаўнай бяспекі з 1976 года. З 1977 года ва Упраўленні КДБ СССР па Магілёўскай вобласці, оперупаўнаважаны, у 1982-1989 гг. начальнік аддзялення па горадзе і чыгуначнай станцыі Крычаў, намеснік начальніка аддзела. У 1989 годзе адкамандзіраваны ў Маскву, у цэнтральны апарат КДБ СССР, памочнік начальніка аддзела Упраўлення кадраў, інспектар, потым старшы інспектар Інспектарскага ўпраўлення. З 1993 года ў Камітэце дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, начальнік Інспекцыі КДБ Рэспублікі Беларусь, потым намеснік начальніка Упраўлення КДБ па Магілёўскай вобласці, у 1994-95 гг. намеснік старшыні КДБ Рэспублікі Беларусь. У 1995-96 гг. у Міністэрстве ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, намеснік міністра – начальнік крымінальнай міліцыі. З 1996 года – першы намеснік Дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь. З 1997 года намеснік старшыні Камітэта па пытаннях бяспекі Саюза (з 2000 – Саюзнай дзяржавы) Беларусі і Расіі.

Узнагароджаны 20 медалямі, 7 нагруднымі знакамі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровы супрацоўнік контрразведкі Расіі.

У вольны час, які атрымоўваецца выкраіць ад вельмі важнай працы, злучанай з барацьбой з найвялікім злом сучаснасці - тэрарызмам, - генерал КДБ піша кнігі для дзяцей, тэксты песень.

Аўтар зборнікаў: “Забавные истории” (2005), “Маша и ее друзья: забавные истории” (2006), “Маша и ее друзья” (2008), “Молекулы в дырявых сапогах” (2011).

Побач з іншымі аўтарамі з’яўляецца складальнікам кароткага біяграфічнага даведніка «Генералы органов государственной безопасности Беларуси» (1918-2008).

# Маладыя аўтары

## АЛЯКСАНДРЫН Аляксандр Анатольевіч




Нарадзіўся  2 студзеня 1983 г. ў Свярдлоўску. У 1992 годзе з сям'ёй пераехаў у Беларусь. Працуе фотакарэспандэнтам хоцімскай  раённай газеты “Шлях Кастрычніка”. Дэбютаваў у зборніку  “Ад бога да Надзвіння”.  Вершы друкаваліся  ў раённай газеце “Шлях Кастрычніка”, абласной газеце “Магілёўскія ведамасці”,  часопісе “Першацвет”, калектыўным зборніку “Прыдняпроўе” (2012 г.)

Пераможца рэспубліканскіх літаратурных конкурсаў “Дзень Зямлі” (2001), “Дэбют” (2003), прызёр абласнога літаратурнага  конкурсу, прысвечанага К.Сіманаву (2011, другое месца). На свяце паэзіі “Пісьмянкоў луг” узнагароджаны Дыпломам другой ступені (2013). Прымаў удзел у IV рэспубліканскім  літаратурным конкурсе «Мы рождены для вдохновенья», які праходзіў у рамках V Міжнароднага  фестываля рускай паэзіі ў  Рэспубліцы Беларусь (2013).

Па п'есах А.Аляксандрына  пастаўлена 5 спектакляў народнага аматарскага  тэатра “Прамень”.

## ЗУБРЫЦКІ Андрэй  Іванавіч



Нарадзіўся  ў 1973 годзе ў Данецкай вобласці. У 1975 годзе з сям'ёй  пераехаў у Беларусь.  Працаваў столярам у Хоцімскім ПМК - 276. Зараз гэта справа застаецца асноўным заняткам жыцця.  Друкуецца на старонках  раённай газеты “Шлях Кастрычніка”.

## КАСТРОЎ Васіль Рыгоравіч



Нарадзіўся 19 лютага 1952 года ў в. Баханы Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыў Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію.

З 1994 года займае пасаду начальніка раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Выршы друкуе на старонках раённай газеты “Шлях Кастрычніка”.

Хоцімскай цэнтральнай раённай бібліятэкай выдадзены два яго зборнікі “Дыхание жизни” (2009), “За весной лето с осенью просятся” (2013).

## СВІРЭПА (Краўцова) Тамара Міхайлаўна



Нарадзілася 6 верасня 1958 года ў в.Трасціно Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўнікаў. Бацька - Краўцоў Міхась Аляксандравіч -настаўнік гісторыі, маці - Емельяненка Лідзія Рыгораўна - настаўнік рускай мовы і літаратуры.

У 1980 годзе скончыла Растоўскі н/Доне Дзяржаўны ўніверсітэт, біёлага-глебавы факультэт.

З 1980 па 1983 гг. працавала аграхімікам у сельгасхіміі г. Міргарада Палтаўскай вобласці.

З 1983 па 1986 гг. - намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце ў Трасцінскай сярэдняй школе Хоцімскага раёна.

У 1986 г. - выкладчыкам у СПТВ №1 ім.Арлоўскага г.Магілёва.

З 1990 па 1992 гг. - навуковым супрацоўнікам-інжынерам лабараторыі № 5 Гомельскага філіяла РАН с/г радыялогіі.

Але каханне да роднай зямлі, хаце, бацькам вярнулі Тамару Міхайлаўну на радзіму.

З 1992 па 2000 гг. яна працуе тэхнолагам вінзавода ў саўгасе "Забялышын", а з 2000 года і па цяперашні час завучам па выхаваўчай рабоце ў Забялышынскай сярэдняй школе.

Пісаць вершы пачала пасля 20 гадоў. У 2010 годзе Хоцімская цэнтральная раённая бібліятэка выдала зборнік вершаў Тамары Свірэпа (Краўцовай) «Извечных дум полёт».

## КУЛЯГІН Леанід Рыгоравіч



Нарадзіўся 1 лістапада 1946 года ў п. Прамень Краснапольскага раёна. Пасля заканчэння Мінскага інстытута фізічнай культуры, працаваў на Краснопольшчыне.

З 1972 года жыве ў Хоцімску. Стаўшы першым сакратаром Хоцімскага райкама камсамола Л. Кулягін з усёй адказнасцю ставіўся да сваіх абавязкаў.

З 1974 года - ветэран педагагічнай працы.

Друкаваўся ў газеце "Чырвоны сцяг" Краснапольскага раёна, у абласной газеце "Магілёўская праўда", у газеце "Шлях Кастрычніка" Хоцімскага раёна, калектыўным зборніку паэзіі “О времени и о себе” (2011).

Узнагароджаны дыпломам абласнога конкурсу патрыятычнай песні ў горадзе Бялынічы (2007). Лаўрэат абласнога конкурсу літаратурнай творчасці ветэранаў педагагічнай працы “Я люблю тебя жизнь!” (2011) .

## ХРАМЯНКОВА Тамара



Нарадзілася 27 лютага 1957 года ў в. Чарняўка Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыла Тупічынскую сярэдняю школу (1973). У школьныя гады пачала пісаць вершы і з тых часоў не растаецца з гэтым захапленнем. У 1975 годзе скончыла Магілёўскае культпрасветвучыліща ім. Н. Крупскай, была рэдактарам сценгазеты. У 1978 годзе паступіла ў Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут ім. А. С. Пушкіна і паспяхова скончыла яго. Трыццаць гадоў адпрацавала школьным педагогам, дзе ўвесь час удасканальвала сваё паэтычнае майстэрства і друкавалася ў абласной прэсе. Цяпер Тамара Храмянкова пражывае ў Маскве. На працягу шматлікіх гадоў публікавалася ў раённай газеце "Шлях Кастрычніка".

## КРАСНОЎ Леанід Вітальявіч

Нарадзіўся на сярэдняй Волзе ў чувашскай рэспубліцы ў 1955 годзе ў мястэчку Камсамольск. Школьныя гады прайшлі на Украіне. Тут жа ў 1976 годзе скончыў Дэбальцэўскае будаўнічае вучылішча. Працаваў у г. Ташкенце (Узбекістан). Гэты час супаў з раннім перыядам творчасці Л. Краснова, яго вершы пачалі друкавацца ў газеце "Вячэрні Ташкент"

У 1986 годзе Л.Красноў пераязджае ў Беларусь. Друкуецца: у раённых газетах "Ленінскі кліч", "Голос Костюковщины", "Шлях Кастрычніка", абласной газеце "Зямля і людзі", у рэспубліканскай газеце "Весткі спажыўкааперацыі".

У 2002 годзе аўтар з'яўляўся дэлегатам злёту беларускай паэзіі, які праходзіў у г.Касцюковічы.

Зараз Леанід Красноў жыве ў в. Батаева Хоцімскага раёна і ўсе яго вершаваныя публікацыі можна знайсці на палосах раённай газеты "Шлях Кастрычніка".

## ШАЛАК Алена Валер'еўна



Нарадзілася 19 ліпеня 1985 года ў г.п. Хоцімск. Публікавацца пачала са школьных гадоў на старонках раённай газеты "Шлях Кастрычніка", абласных газет "Магілёўскія ведамасці", "Магілёўская праўда". Дэбютавала ў зборніку " Ад Бога да Надзвіння".

Алена Шалак прызнана пераможцай Рэспубліканскага конкурсу маладых талентаў "Дэбют", з'яўляецца лаўрэатам міжнароднага конкурсу "Дзеці свету пра Казахстан", брала ўдзел у Міжнародным фэсце "Славянское братство без границ" і ў намінацыі "Аўтарская паэзія" стала пераможцай.

Пасля заканчэння гістарычнага факультэта Магілёўскага Дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя А. Куляшова жыве і працуе ў г. Мінску.

З творчасцю маладой паэткі можна пазнаёміцца ў зборніку вершаў членаў АА "БЕЛТІЗ" "За всё тебя благодарю". З'яўляючыся інвалідам па зроку, Алена не губляе бадзёрасць духу, займае актыўную жыццёвую пазіцыю і ўвесь час знаходзіцца ў пошуку новых рашэнняў. Яе паэтычнае слова гучала на Мінскім гарадскім конкурсе прафсаюзных арганізацый і прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці. Дзейнасць Алены не абмежавана літаратурна-мастацкай творчасцю. Яна стала лаўрэатам выступленняў жаночага народнага акадэмічнага ансамбля "Легата" класічнай і духоўнай музыкі.

## ЗМЕСТ


**АД СКЛАДАЛЬНІКА**…………………………………………………......3

**КЛАСІКІ**

БРАЙЦАЎ Якуб Раманавіч……………………………………………..4

ЗАРЫЦКІ Аляксей Аляксандравіч……………………….………4

КАРПЕНКА Міхаіл Фядотавіч……………………………………..5

ПРЫХОДЗЬКА Пятро (Пётр Фёдаравіч)…………………………6

**СУЧАСНІКІ**

МІНКІН Алег Гаўрылавіч……………………………………..…8

РАМАНЕНКА Іван Конанавіч …………………………………….9

САВУШЫНСКАЯ Надзея Феакцістаўна…………………………....9

ЦЕРАХАЎ Аляксандр Іванавіч…………………………..………10

ЮРКІН Іван Захаравіч……………………………………………..10

**МАЛАДЫЯ АЎТАРЫ**

АЛЯКСАНДРЫН Аляксандр Анатольевіч………………...…….12

ЗУБРЫЦКІ Андрэй Іванавіч……………………………….……..12

КАСТРОЎ Васіль Рыгоравіч……………………………………..13

СВІРЭПА (Краўцова) Тамара Міхайлаўна……………….........13

КУЛЯГІН Леанід Рыгоравіч………………………………........14

ХРАМЯНКОВА Тамара……………………………………………...14

КРАСНОЎ Леанід Вітальявіч……………………………………15

ШАЛАК Алена Валер’еўна……………………………..…..15

**Пісьменнікі-землякі**
**Даведнік**

Складальнік:  А.Ф.Лутчанкова

Адказны  за выпуск:   Р.А.Касталонава

Хоцімская бібліятэчная сетка
Цэнтральная раённая бібліятэка

213660  Магілёўская вобл., г.п. Хоцімск,
пл. Леніна, 5